Пасля жніва работа не спыніцца

Сёлета ААТ «Мацеевічы» святкуе 70-годдзе. І гаспадарцы, безумоўна, ёсць чым ганарыцца. Таварыства займае трэцяе месца ў раёне па ўраджайнасці збожжавых і зернебабовых культур. Пра сёлетнія дасягненні і планы на будучыню карэспандэнту газеты Жабінкаўскага раёна «Сельская праўда» расказаў дырэктар ААТ «Мацеевічы» Мікалай КАВАЛЬЧЫК.

— У верасні, пры запуску цукровага завода, пачнём уборку буракоў, — кажа кіраўнік. — Імі ў нас засеяна 300 гектараў. Плануем сабраць каля 15 тысяч тон. У нас ёсць уласны буракаўборачны камбайн, якому давядзецца папрацаваць адразу ў дзвюх гаспадарках: сёлета мы заключым дагавор аб аказанні дапамогі ААТ «Жабінкаўскі». Работа будзе напружаная. У галіне жывёлагадоўлі мы таксама не адстаём па паказчыках. Сёння ў ААТ «Мацеевічы» налічваецца 3410 галоў буйной рагатай жывёлы, пагалоўе дойнага статка складае тысячу галоў. Для іх утрымання ў гаспадарцы дзейнічаюць восем жывёлагадоўчых фермаў.

Час прыбрацца

Лельчыцкі раённы Савет дэпутатаў выступіў з ініцыятывай аб арганізацыі штотыднёвых суботнікаў на тэрыторыі сельскіх Саветаў. Першы па чарзе быў Бараўскі сельсавет, піша карэспандэнт «Светлага жыцця».

www.lelchitsy.by

З самага ранку мабільны тэлефон старшыні сельвыканкама Людмілы Ашомкі, здавалася, не змаўкаў ні на хвіліну. Яна давала распараджэнні згодна з распрацаваным планам і паралельна дамаўлялася з дастаўкай то мотакасы, то бензапілы, то вяроўкі для выдалення дрэў, якія ўсохлі.

У маланаселеным пункце Тартак фронт работ значны: неабходна было высекчы дробную хмызняковую расліннасць уздоўж цэнтральнай дарогі і былога будынка школы, прыбраць могілкі, несанкцыянаваную звалку, прылеглую тэрыторыю да таварнай фермы і гэтак далей.

У суботніку прыняў актыўны ўдзел і старшыня раённага Савета дэпутатаў Сяргей Касінскі.

Вяртанне з прытулку

Паўгода Назар, Васіліса і Сафія чакалі ў сацыяльным прытулку сваю маці. Яна змагла пераадолець свае шкодныя звычкі і забраць дзяцей дадому, піша карэспандэнт «Раённага весніка» Чэрвеньскага раёна.

Сёлета 8 лютага раённая камісія па справах непаўналетніх прыняла рашэнне аб адабранні трох непаўналетніх дзяцей у жыхаркі вёскі Горкаўская Слабада. Як растлумачыла намеснік старшыні камісіі па справах непаўналетніх Наталля Сцяжко, жанчына злоўжывала алкаголем, не займалася выхаваннем дзяцей і стварыла для іх нязносныя ўмовы жыцця. Маці накіравалі на лячэнне. Яна яго прайшла, і зараз мае намер дастойна выхоўваць сваіх дзяцей, працуе, не ўжывае спіртнога. Час на выпраўленне становішча прайшоў. На пачатку жніўня камісія прыняла рашэнне вярнуць дзяцей маці. Але некаторы час сям'я будзе ў полі зроку камісіі.

Надзея АНІСОВІЧ.

БЕЗ ЖАЛЕЗА, АЛЕ НЕ ПАЎСЮЛЬ

Забяспечанасць насельніцтва вадой пітной якасці на Гомельшчыне паступова набліжаецца да 90 %

Сёлета 65 тысяч жыхароў Рэчыцы на свае вочы ўпэўніліся, што нарэшце з кранаў цячэ чыстая вада. Пабудаваная станцыя абезжалезвання вырашыла праблемы, якія існавалі дагэтуль. Паводле санітарных правілаў і нормаў, у пітной вадзе лімітавана дапушчальная канцэнтрацыя жалеза — да 0,3 міліграма на літр. Цяпер у рэчычан — толькі 0,1 мг. Між іншым, раней было 0,6–0,7 мг.

Будаўніцтва станцыі на водазаборы «Галаўной» планавалася даўно. Магчымасць з'явілася, калі Міжнародны банк рэканструкцыі і развіцця выдаткаваў на рэалізацыю праекта пазыку ў памеры 2 мільёнаў 175 тысяч долараў.

Станцыю новага пакалення пабудавалі за 8,5 месяца «пад ключ»: ад заказу, вытворчасці абсталявання, пуска-наладачных работ да сэрвіснага абслугоўвання. Яна цалкам аўтаматызаваная. Да таго ж — энергаэфектыўная. Вада паступае на ачыстку без дадатковага помпавага абсталявання, самацёкам. У Рэчыцы скарыстана адна з апошніх распрацовак — безнапорная блокава-модульная станцыя «Крышталь-Б». Пры гэтым выкарыстоўваецца палімернае рэчыва айчыннай вытворчасці. У станцыях папярэднага пакалення выкарыстоўваўся друз, кварцавы пясок і вугаль, а ў новай — палімерная крошка. Менавіта на яе асядае жалеза. Брудная вада скідваецца, а чыстая ідзе спажыўцу. Акрамя таго, у Рэчыцкім раёне сёлета пабудаваны вадавод ад станцыі абезжалезвання ў Холмечы да вёскі Дварэц, а два гады таму жыхары вёскі Зашчоб'е таксама сталі спажываць чыстую ваду.

За кошт сродкаў мясцовага бюджэту ў гэтым годзе мадэрнізавалі сістэму водазабеспячэння ў трох населеных пунктах Мазырскага раёна, у адным — Жыткавіцкага. Выканана закальцоўка водаправоднай сістэмы ў вёсцы Беліца Жлобінскага раёна з водаправоднай сістэмай райцэнтра, пабудавана станцыя абезжалезвання ў вёсцы Папаратнае, расказаў **намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага аб'яднання «Жыллёва-камунальная гаспадарка Гомельскай вобласці» Вячаслаў ПАРХОМЕНКА:**

— Вадой, якая адпавядае ўсім санітарным нормам і правілам, з 2016 года карыстаюцца і жыхары вёскі Акцябр у Жлобінскім раёне. Мясцовае камунальнае прадпрыемства далучыла населены пункт да гарадскіх водаправодных сетак за кошт уласных сродкаў прадпрыемства. Акрамя таго, у КВУП «Гомельводаканал» рэалізавалі праект «Водазабеспячэнне мікрараёна Касцюкоўка ў Гомелі». Паўночны раён абласнога цэнтра далучаны да гарадской сістэмы водазабеспячэння. Зроблена гэта было за кошт сродкаў мясцовага бюджэту і ўласных сродкаў прадпрыемства.

Гэта работа — частка дзяржаўнай палітыкі, якая на сённяшні момант замацавана спецыяльнай праграмай «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» і яе падпраграмай «Чыстая вада» на 2016—2020 гады». Для дасягнення мэтавых паказчыкаў забеспячэння насельніцтва вадой пітной якасці праводзяцца такія мерапрыемствы, як, напрыклад, далучэнне сістэмы водазабеспячэння населеных пунктаў з якасцю вады, якая не адпавядае гігіенічным патрабаванням, да побач размешчаных населеных пунктаў.

Спецыялісты разлічваюць, што праграма «Чыстая вада» будзе працягнута да 2025 года. Тады і атрымаецца цалкам зняць з парадку дня пытанне забеспячэння вадой пітной якасці ўсяго насельніцтва Гомельшчыны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

БОБОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ГОМЕЛЬСКОГО РАЙОНА

3 октября 2018 года в 15.30 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Инженерная инфраструктура	Расходы по подготовке (руб.)	Начальная цена земельного участка (руб.)	Задаток (руб.)
1	Гомельский район, Бобовичский с/с, аг. Бобовичи, ул. Садовая, участок № 2 В	321080800601000890	0,1242 га	Имеется возможность электроснабжения, централизованного водоснабжения, дорога в гравийном состоянии	1147,21 и расходы за опубликование в СМИ	6396,3	639,6
2	Гомельский район, Бобовичский с/с, аг. Бобовичи, ул. Садовая, участок № 241	321080800601000941	0,1260 га	Имеется возможность электроснабжения, централизованного водоснабжения, дорога в гравийном состоянии	1184,24 и расходы за опубликование в СМИ	6489	649
3	Гомельский район, Бобовичский с/с, аг. Бобовичи, ул. Луговая, участок № 50	321080800601000974	0,1293 га	Имеется возможность электроснабжения, дорога в гравийном состоянии	1407,16 и расходы за опубликование в СМИ	7809,72	781
4	Гомельский район, Бобовичский с/с, д. Уза, ул. Лесная, участок № 69	321080801201000260	0,1388 га	Имеется возможность электроснабжения, централизованного газоснабжения	1313,26 и расходы за опубликование в СМИ	7564,6	756,5

Аукцион состоится по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, д. 51А, зал заседаний Гомельского райисполкома **03.10.2018 в 15.30.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток в размере, порядке и сроке, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

Документ, подтверждающий внесение суммы задатков (на расчетный счет с отметкой банка).

Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 %).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона или единственным участником аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Задаток за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет № BY74AKBB36414140200453100000 Бобовичского сельского исполнительного комитета, филиал № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Барыкина, 94, код банка AKBBB421302, УНП 400178403.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Бобовичи, ул. Пролетарская, 1А, Бобовичский сельский исполнительный комитет с даты опубликования извещения до 1 октября 2018 года.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в Бобовичском сельском исполнительном комитете.

Контактные телефоны: +375291390201, 910244

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 30 жніўня 2018 года.